8. Матвеев М.Ю. Причины устойчивости «библиотечных» стереотипов и основные подходы к их преодолению // Новая библиотека. 2007. № 8. С. 5–17.

9. Токаренко, Е.М. «Одним словом библиотекарь…»: проблемы имиджа за рубежом / Е.М. Токаренко // Молодые в библиотечном деле. – 2009. – № 4. – С. 11 – 14.

**Шкурская А.У.,** студэнт 114т гр.

Навуковы кіраўнік – Гулак А. А.

## ПАХОДЖАННЕ АСОБНЫХ ТАПАНІМІЧНЫХ АДЗІНАК СЛУЦКАГА РАЁНУ

Тапонімы–гэта частка гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Яны захоўваюць каштоўную інфармацыю пра характар засялення пэўнай тэрыторыі, заняткі насельніцтва і наогул асаблівасці гістарычнага развіцця пэўнага рэгіёна. Фактары фарміравання тапаніміі Беларусі ўказаны ў працы ЯротаваА.Я. «Топонимика Беларуси. Пути формирования топонимики Беларуси На территории Беларуси» (2011).

Даследчык указвае асноўныя фактары фарміравання тапаніміі Беларусі: *гістарычны, лінгвістычны, этнічны, прыродны (ландшафтна-геаграфічны)*, а таксама *афіцыйнае перайменаванне*.

На сучасны тапанемічны фон Беларусі значны ўплыў аказаў фактар афіцыйных пераносаў. Пачынаючы з трыццатых гадоў мінулага стагоддзя ў рэспубліцы перайменавана больш за 500 населеных пунктаў [5. с. 1].

Аб‘ектам нашага даследвання з‘яўляюцца тапонімы Слуцкага раёну. У межах артыкула разгледзім паходжанне асобных з іх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тапонім *Шведы* ўтварыўся ў выніку гістарычных падзей, якія адбываліся ў 1706 годзе, калі шведскае войска, якое вяло вайну з ВКЛ знішчыла шмат раёнаў, сярод якіх Слуцкі. Таксама ёсць гіпотэза, што гэтая назва можа паходзіць ад прозвішча чалавека *Швед,* які заснаваў дадзеннае паселішча [1. с. 408].

Вёска *Вынішчы* – назва пайшла ад слова «вынння» – натуральная паляна, вялікая прагаліна сярод лесу [1. с. 62]. Таксама ёсць літаратурны варыянт паходжання назвы: нібыта, учасы, калі слуцкія землі былі ў складзе Вялікага княства Літоўскага, групапа лякаў за нейкую правіннасць была выселена з Польшчы і паселена асобна ў Слуцкім княстве. Такім чынам яны былі *вынішчаны*, бо назаўжды выселены з родных мясцін. На нашу думку, першая версія з‘яўляецца больш навуковай.

У аснове назвы *Кухты* састарэлы тэрмін з сэнсавым значэннем «кухар». У феадальнай сярэднявечнай Беларусі *кухта* быў дзеншчыкам, паслугачом падчас паходаў, палявання і г.д. Магчыма чалавек з такой мянушкай заснаваў паселішча: меў зямлю і жаніў і пасяліў там сваіх дзяцей. Множны лік у назве сведчыць пра калектыўны характар пасялення (нашчадкі). Але не выключана магчымасць сувязі назвы з рускім тэрмінам «кухты» – шэрань і блізкім да гэтага беларускага дыялектнага слова, якое абазначае сівы мох на ссохлых дрэвах [1. с. 192]. Такім чынам, назва магла ўказваць на характар раслліннасці, магчыма на забалочанай глебе.

Тапонім *Хваевіца* сведчыць нам аб тым, што паселішча было заснавана блізх ваёвага леса, або ў лесе [2. с. 377].

*Слабадой* у XV–XVII стст. называліся пасёлкі на нераспрацаваных лясных дзялянках. У іх сяліліся «вольнікі», «слободзічі» [2.с. 348].

Разледзім некалькі назваў звязаных з характарам земляробства. Выдатная даследчыца беларускай тапанімікі В. Лемцюгова піша, што» у старабеларускай мове *рубежъ* – памежны знак, грань на мяжы прыватных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зямельных уладанняў. Яго функцыю выконвала засечка на дрэве, земляны капец, камень і інш. Паселішчы, якія ўзнікалі на зямельным парубежжы называліся Рубеж, Рубежы, Падрубеж» [2. с. 319]. Гэта дазваляе зрабіць вывад пра тое, што адпаведны тапоніму Слуцкім раёне меў менавіта такое паходжанне.

Назва *Ніва* пайшла ад слова ніва–апрацаваны ўчастак зямлі пад ворыва, зямля, у якую ўкладзена шмат сіл [1, с. 256].

Адносна тапоніма *Лядно*: *ляда*–тэрмін падсечна-агнявога земляробства, які абазначае» месца, ачышчанае ад хмызняку пад пасеў», «ворны ўчастак на месцы лесу». Лядна-агнявым земляробствам займаліся крывічы, дрыгавічы, радзімічы і іншыя славянскія плямёны [2. с. 234].

Відавочна, што назва *Чапліцы* паходзіць ад слова чапля. В. Жучкевіч выказвае думку, што людзі жыўшыя на нейкай пэўнай тэрыторыі верылі ў першапродка. Гэтымі першапродкамі былі жывёлы, птушкі і г.д. [1, с. 399]. На нашу думку, міфалагічнае значэнне некалькі пераўвялічана. Хутчэй за ўсё, назва абазначае месца, дзе гэтыя птушкі заўсёды вадзіліся, балоцістае або з наяўнасцю водных аб'ектаў. Гэтую версію пацвярджае і тапонім *Чайчыцы*, які паходзіць ад назвы птушкі – чайка.

*Белы Бор*: бор (сасновы лес) – геаграфічны тэрмін, які сустракаецца вельмі часта ў тапонімах Беларусі [1. с. 32]. Таксама важна падкрэсліць, што корань *белы* кажа пра тое, што гэтую назву можна разглядаць як старажытную.

Разгледзім тапонімы, звязаныя з назвамі рэк. *Танежыцы* – вёска на рацэ Тонеж [2, с. 366]. Назва *Рыжыца* магчыма паходзіць, па назве балотнай рэчкі з рыжай (рудой, іржавай) вадой [2, с. 328].

Назва *Карма* ў аснове мае слова карма – затока, завадзь. Таксама ёсць значэнне сенажаць, урочышча. Некаторыя даследчыкі мікратапаніміі лічаць, што *карма* – гэта агульная назва кармавых угоддзяў, на якіх добрая,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сакавітая трава для корму жывёлы [2.с. 189]. На нашу думку, гэтыя дзве гіпотэзы не вельмі супярэчаць адна адной і могуць быць прынятыя да ўвагі.

Вёска *Прошчыцы* ў пісьмовых крыніцах упамінаецца з 1566 г. Назва мае адносіны да прошчы. Паводле этнаграфаў, *прошча* (крыніца возера, камень) –месца, надзеленае незвычайнымі цудадзейнымі сіламі. Да іх ішлі паломнікі за адпушчэннем грахоў і інш. Каля прошч будавалі капліцы, цэрквы, касцёлы, наладжвалі крэсныя хады. Некаторыя прошчы ўзніклі з язычніцкіх свяцілішчаў [2, с. 296].

Такім чынам, у ходзе даследвання было вызначана, што на характар паходжання асобных тапонімаў Слуцкага раёна значны ўплыў аказаў прыродны (ландшафтны) фактар і земляробства, як асноўны характар жыццядзейнасці чалавека.

---

1. Жучкевич, В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии. – Мн. : Изд-во БГУ, 1974. – 448 с.

2. Лемцюгова, В.П. Тапонімы распавядаюць. – Мн. : Літ. і маст., 2008. – 416 с.

3. Памяць: Слуцкі раён. Слуцк: у 2 кн. / уклад. В.С. Відлога; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мн. : БЕЛТА, 2000–2001.

4. Рылюк, И.Я. Истоки географических названий Беларуси с основами топонимии. – Мн. : Веды,1997. – 178 с.

5. Яротов, А.Е. Общая топонимика: практикум для студентов географического факультета специальности 1-31 02 01 «География. Научно-педагогическая деятельность». – Мн. : БГУ, 2013. – 34с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ